индустрия и культурная политика в Европе / I. Matsevich. – Minsk, 2010.

7. Федоров, В.С. Современный тип производства знания – «Mode 2» / В.С. Федоров // Социальная философия науки. Российская перспектива. – М., 2014. Т.6. Секция 5. С. 36-38.

8. The new production of knowledge: the dynamics of science and research in contemporary societies. – London, 1994.

***Мікуліч Д.Ю., Жоголь Н.Н.*** **Духоўная спадчына Еўфрасінні Полацкай і сучаснасць**

Еўфрасіння Полацкая - князёўна, ігумення, першы наш вядомы педагог, асветніца, першая жанчына, кананізаваная праваслаўнай царквой у святыя. Гісторыя данесла пра яе не надта багатыя звесткі, але і яны дазваляюць убачыць агульнаеўрапейскую значнасць асобы гэтай надзвычай таленавітай жанчыны-падзвіжніцы. Яе ахвярная праца высока падымала аўтарытэт Полацкага княства і ўсіх земляў нашых продкаў.

На пачатку XII стагоддзя ў сям'і полацкага князя Святаслава-Георгія, малодшага сына Усяслава Чарадзея і княгіні Сафіі нарадзілася дачка. Дзяўчынку назвалі старажытным полацкім імем Прадслава. Вучылася Прадслава ў школе пры Сафійскім саборы або дома, пры княжым двары. Настаўнікамі былі духоўныя асобы, найперш манахі, падручнікамі — Святое Пісанне, жыцийная літаратура. «Жыціе» адзначае яе любасць да вучэння, стараннасць і вялікія здольнасці. Слава аб прыгажосці і адукаванасці Прадславы разнеслася «по всем градам», і ў Полацк, да князя Святаслава-Георгія, зачасцілі сваты. «Жыціе» апавядае, што, калі князёўне споўнілася дванаццаць гадоў, бацькі вырашылі аддаць яе замуж. І тут нечакана для блізкіх яна выбірае іншую пуцявіну. Прадслава прыходзіць у манастыр і пад імем Еўфрасінні таемна ад бацькоў прымае пострыг. За манастырскімі сценамі юная манашка магла значна паўней наталіць знаёмую ёй з дзяцінства прагу ведаў. Кола яе чытання было шырокае і разнастайнае.

Пражыўшы нейкі час за манастырскімі сценамі, Еўфрасіння папрасіла ў полацкага епіскапа Ільі дазволу пасяліцца ў Сафійскім саборы. Атрымаўшы ўладыкава блаславенне, княжна-манашка памяняла свой ранейшы прытулак на келлю ў Сафіі і «нача книгы

писати своими руками». Працэс пісання ў той час быў вельмі складаны і марудны. Каб перапісваць кнігі, мала добра ведаць грамату - неабходна мець і мастацкія здольнасці, бо пачатковыя літары і загалоўкі раздзелаў трэба было аздабляць арнаментам. Частка Еўфрасінніных кніг ішла на продаж, а атрыманыя грошы па яе просьбе раздавалі бедным.

Атрымаўшы дазвол епіскапа Ільы, князёўна-манашка заснавала на беразе Палаты, за дзве вярсты ад Полацка, жаночы манастыр, а пазней, пры царкве Багародзіцы,- і мужчынскі. У манастырах пад кіраўніцтвам асветніцы дзейнічалі майстэрні па перапісванні кніг - скрыпторыі, адкуль кнігі разыходзіліся па ўсёй Полацкай зямлі і за яе межы. Іх чыталі вучоныя манахі і прадстаўнікі феадальнай знаці, па іх вучыліся грамаце дзеці. Вучоныя выказваюць меркаванні, што яна і сама пісала рэлігійныя творы, займалася перакладамі, а галоўнае - рыхтавала новых перапісчыкаў. Дзеля гэтага выхоўвала хлопчыкаў і дзяўчынак, вучыла іх грамаце. Еўфрасіння Полацкая, як гаворыцца ў «Жыціі», «кожны дзень павучала сясцёр сваіх: старых вучыла цярплівасці; юных жа навучала душэўнай чысціні; хадзе спакойнай, голасу ціхмянаму, слову дабрачыннаму, ядзе і піццю маўкліваму; у адносінах да старэйшых быць пакорлівымі, а мудрых слухаць; да роўных і меншых - любові некрывадушнай; менш казаць, а болей разумець».

Знаходзячыся ў цэнтры культурнага жыцця Полацкай зямлі, асветніца выступала ў ролі збіральніцы талентаў, своеасаблівай мецэнаткі. Па яе заказу дойлід Іаан пабудаваў сусветна вядомую царкву Спаса - дасканалы ўзор полацкай архітэктурнай школы. Спаская царква ў Полацку, як і ўвесь архітэктурны комплекс Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, уключана ў склад мясцовага гістарычна-археалагічнага запаведніка. Асветніца спрыяла стварэнню унікальных фрэскавых роспісаў Спаскага храма, у якім самае моцнае ўражанне пакідае выява святой Еўфрасінні.

З імем Е. Полацкай звязаны і славуты крыж, створаны мясцовым майстрам Лазарам Богшам. У многіх дакументах гэты шэдэўр старажытнабеларускага ювелірнага мастацтва так і называецца - крыж Е. Полацкай. Ствараўся напрастольны крыж для царквы Спаскага манастыра ў 1161 годзе. Крыж быў шасціканцовым, невялікага памеру. Даўжыня яго каля 52 сантыметраў. З абодвух бакоў знаходзілася 20 абразоў святых, архангелаў і апосталаў

царквы. Гэтая нацыянальная святыня прапала ў 1941 годзе. Падчас святкавання тысячагоддзя Полацкай епархіі і Праваслаўнай царквы на Беларусі (1992) было вырашана ўсеправасланую святыню аднавіць. Узнавіць святыню даручылі брэсцкаму ювеліру-эмаліроўшчыку М. П. Кузьмічу. У 1997 годзе адноўлены старажытны Крыж прападобнай Е. Полацкай быў асвечаны і пакладзены ў храме Праабражэння Гасподняга ў Полацкім Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры.

Паводле «Жыція» Е. Полацкая, атрымаўшы абраз святой Багародзіцы, молячыся, выказала пажаданне: «Каб жа дайсці мне да святога горада Ерусаліма і пакланіцца труне Гасподняй і ўсім месцам святым: бачыць і цалаваць, і скончыць там жыццё сваё». На схіле жыцця яна і сапраўды вырашыла здзейсніць святое паломніцтва. Прыбыўшы ў Ерусалім, Е. Полацкая накіравалася да труны Гасподняй, дзе малілася. Еўфрасіння папрасіла Бога, каб той дазволіў ёй памерці ў святым горадзе.

Мяркуецца, што памерла Еўфрасіння прыкладна 23-24 мая 1167 года. Пахавана яна была ў Ерусалімскім Феадосіявым манастыры святой Багародзіцы. У 1187 годзе ўсходнеславянскія манахі забралі раку з астанкамі Еўфрасінні (рака - свайго роду куфар для захоўвання святых мошчаў) і прывезлі яе ў Кіеў, дзе перазахавалі ў Кіеўска-пячорскім манастыры. Астанкі святой Еўфрасінні вярнуліся ў родны Полацк у 1910 годзе. Аднак у 1922 годзе адбыллося ўскрыццё мошчаў, якія экспанаваліся на атэістычнай выстаўцы ў Маскве, а потым былі выстаўлены ў Віцебскім краязнаўчым музеі. У Полацк вярнуліся толькі ў 1943 годзе, дзе і захоўваюцца цяпер у храме святога Спаса.

Ужо неўзабаве пасля смерці найпадобнейшай Еўфрасінні ў гонар яе былі складзеныя трапар і сціхіра. Канцом таго самага XII стагоддзя датуецца і стварэнне яе «Жыція». Гэта магло адбыцца толькі пры ўмове далучэння полацкай ігуменні да ліку святых. Сёння найпадобнейшую Еўфрасінню разам з праваслаўнымі беларусамі глыбока шануюць і католікі. Е. Полацкая - адна з самых адукаваных еўрапейскіх жанчын XII стагоддзя, першая беларуская асветніца, першая з жанчын, каго царква аднесла да святых. Менавіта яна заснавала Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр у Полацку, пабудавала Спаса-Праабражэнскую царкву і храм Прасвятой Багародзіцы. Духоўны ўплыў беларускай асветніцы Еўфрасінні

Полацкай выйшаў далёка за межы старадаўняй эпохі.

Поле дзейнасці святой Еўфрасінні было вельмі шырокае і даволі ўрадлівае. Гэтаму садзейнічала яе ўроджаная здольнасць, высокая асвета і асаблівая ласка Божая. Усё гэта натхняла яе да важных і адважных пачынанняў. Аб надзвычайных прыродных здольнасцях святой Еўфрасінні сведчыць яе нахіл з ранняй маладосці да глыбокіх разважанняў над сэнсам жыцця, да навукі, лёгкае ўспрыманне граматы. А найважнейшае - гэта тое, што яна мела нязломную волю развіць гэтыя свае здольнасці як магчыма найлепш і ахвяраваць свядома і добрахвотна іх на службу Богу і народу. Яна не шкадуе сілы на развіццё сваіх здольнасцяў, каб гэтым самым яе ахвяра была большая і свяцейшая. Мы бачылі, што св. Еўфрасіння дома атрымала толькі пачаткавую асвету, але потым з першага свайго манастыра яна перасяляецца ў Свята-Сафійскую царкву, дзе была вялікая бібліятэка, і там здабывае вышэйшую асвету, прыкладае ўсе сілы для пашырэння асветы паміж сваіх суродзічаў. Яна не толькі перапісвае кнігі, але і перакладае іх з грэцкае і лацінскае моў на сваю родную, каб такім чынам узбагаціць сваю літаратуру.

Божая ласка бачна падтрымлівала на кожным кроку яе сілы і гартавала да вялікіх учынкаў. Ніводнае яе пачынанне не засталося незакончаным. У яе жыцці ёсць ясны прыклад, як здзейсніваюцца словы Хрыста: «Шукайце перш валадарства Божага і справядлівасці Яго, а ўсё іншае даложыцца вам». За светлым прыкладам святой Еўфрасінні паўставалі, разрасталіся адзін за другім жаночыя і мужчынскія манастыры, пры іх паўставалі школы, прытулкі для ўбогіх, хворых і сірат.

З XII стагоддзя ў Полацку пачынаецца рэлігійнае і культурнае аднаўленне краю. Святая Еўфрасіння пашырала асвету і хрысціянства. Яна абрала шлях не змагання са старымі традыцыямі, а асвячэння ўсяго таго, што магло асвяціць хрысціянства. Гэты падыход ясна відаць у будове царквы св. Спаса, у якой першы раз у гісторыі беларускай культуры была спалучана мулярская візантыйская тэхніка з тагачасным беларускім народным будаўніцтвам. Тое самае сталася і з народным мастацтвам, якое было спалучана з іканаграфіяй. Гэткім чынам можна было лёгка ахапіць хрысціянізацыю краю аж да найніжэйшых народных пластоў уключна, і гэтым самым быў зроблены крок уперад у

гісторыі беларускай культуры і хрысціянізацыі Беларусі. З іменем святой Еўфрасінні блізка звязаны імёны першага беларускага дойліда Івана з Полацка і мастака Лазара Богшы, што безумоўна сведчыць пра тое, што дзейнасць святой Еўфрасінні стварыла добры грунт для развіцця народных талентаў.

Дабрадзейны ўплыў святой Еўфрасінні не абмяжоўваўся толькі рэлігійным і культурным полем, ён бачны таксама ў грамадскім і дзяржаўным жыцці. Ужо хоць бы дзеля таго, што полацкія князі былі яе найбліжэйшай раднёй, між князямі і святой Еўфрасінняй былі вельмі блізкія суадносіны, у якіх часта можна заўважыць дабрадзейны ўплыў святой. Гэты ўплыў меў на мэце палагодзіць мірным спосабам усякія непаразуменні між князямі, «бо не хацела бачыць, каб былі ў суцяжніцтве між сабою князь з князем, ці баярын з баярынам, ці просты чалавек з сваім бліжнім, але хацела, каб усе былі як адна душа», - кажа жыццяпісец.

Святая Еўфрасіння была ў блізкіх адносінах не толькі са сваімі князямі, але таксама і з візантыйскім імператарам Мануілам Комнінам, з якім вяла карэспандэнцыю. Гэты факт сведчыць таму, што Еўфрасіння садзейнічала рэлігійнай палітыцы імператара Мануіла, якая накіроўвалася на паяднанне Усходняе і Заходняе Цэркваў. На нашых землях тады яшчэ не было і следу варожасці між Цэрквамі, але, відаць, дзякуючы ўплыву святой, нават епіскапы-грэкі ў Полацку не рабілі нічога, каб гэтую варожасць распальваць.

Шырокае поле дзейнасці святой Еўфрасінні бяспрэчна мусіла высока падняць аўтарытэт не толькі Полаччыны, але і ўсяе Беларусі ў вачах візантыйскага імператара і патрыярха, ужо не кажучы аб суседніх княствах. Светлы прыклад, ахвярнае жыццё, рухавая дзейнасць, шчырая малітва і бязмежнае самааданасць святой Еўфрасінні спрыялі росквіту хрысціянства на Беларусі, узвышалі пачуццё дабра і красы, збольшвалі важнасць спасення душы, уздымалі асвету і культуру беларускага народа - таму так высока цэніць і шчыра любіць народ гэтую сваю святую.

У 1984 годзе Еўфрасіння Полацкая была прылічаная да Сабора Беларускіх Святых. Яе імя носяць цэрквы ў Саўт-Рывер (ЗША) і Таронта (Канада). Беларускі народ шануе памяць Еўфрасінні Полацкай. У дзень яе памяці - 5 чэрвеня - у Полацк штогод прыязджаюць людзі пакланіцца мошчам святой Еўфрасінні. У гэты

дзень праводзіцца служба, выносіцца Крыж Еўфрасінні Полацкай. На гэтым мерапрыемстве заўсёды прысутнічае мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Два помнікі святой Еўфрасінні ўстаноўлены ў г. Мінску, адзін з іх - на праспекце Незалежнасці, есць і вуліца Еўфрасінні Полацкай ў Мінску.

У 2000 годзе ў Полацку адкрыты помнік святой Еўфрасінні. Аўтар скульптурнай кампазіцыі - І.Голубеў. Е. Полацкая намаляваная ў строгім манаскім адзенні, з крыжам Лазара Богшы ў руках. Помнік Е. Полацкай з'яўляецца сімвалічным пачаткам падзвіжніцкага шляху Еўфрасінні. І сёння Еўфрасіння праз стагоддзі бласлаўляе сваіх землякоў.

“Прыкладам тваім, Маці, Прасьветніца Беларусі, можна збавіціся, бо ты ўзяла крыж і пайшла за Хрыстом і прыкладна вучыла, як трэба грэбаваць целам, а ходацца за душу несьмяротную. Дзеля гэтага, дастойная Еўфрасіння Вялікая, князёўна Полацкая, твой дух будзе радавацца разам з анёламі” (Праваслаўны малітоўнік).

## ***Дашкевич Е., Волнистый А.Г.*** **Философия Евфросинии Полоцкой**

Е. Полоцкую по праву считают и помнят как небесную заступницу белорусской земли. Вечную память и любовь белорусского народа она заслужила своей жертвенной жизнью, предназначенной просвещению наших предков. Дочь князя Святослава Предслава, таково было мирское имя княжны, личным примером осознанно выбрала путь просвещения, потому что хорошо знала, что славу и мощь Беларуси нужно добывать не только военной силой, но и знаниями. В юном возрасте она приняла постриг, стала монашкой, поселилась в келье Софийского собора. Там она переписывала и переводила книги и, как считают некоторые историки, вела Полоцкую летопись. Через некоторое время там же ею был основан женский, а позднее и мужской монастыри. При них были созданы школы, где дети учились грамоте, истории, греческому и латинскому языкам, искусству красноречия.

Во II половине XII века княжна-просветительница написала «Житие Евфросинии Полоцкой». Сам факт создания такого